*А. Чарвякоў*

# Задачы саветаў і дзяржапарату у 3-м годзе пяцігодкі

Галоўнай задачай саветаў зьяўляецца няўхільнае і цьвёрдае правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі. З гэтае прычыны тая справаздачна-перавыбарчая кампанія саветаў, што адбываецца ў сучасны момант, ставіць, як асноўную задачу, перабудову ўсёй працы саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду на аснове ўзьняцьця ролі саветаў, як праваднікоў генэральнай лініі партыі, як рашучых барацьбітоў супроць варожых лініі партыі правага і «левага» апартунізмаў.

Важнейшыя задачы стаяць перад саветамі ў наступаючым годзе.

Пасьпяховае выкананьне задач трэцяга году пяцігодкі — рашаючага году для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады—патрабуе надзвычайнага пашырэньня савецкага дэмакратызму, гэта значыць «далейшага ўмацаваньня актыўнасьці мас ва ўсёй справе сацыялістычнага будаўніцтва».

Каб выканаць сваю ролю, саветы павінны ва ўсёй сваёй рабоце апірацца на масавы актыў і перш за ўсё на ўдарнікаў фабрык і заводаў і на калгасьнікаў і беднату ў вёсцы. Выкарыстаньне новых сацыялістычных форм працы ў якасьці ўдарніцтва, сацспаборніцтва і г. д., шырокае разгортваньне пралетарскай крытыкі і самакрытыкі павінна быць штодзенным мэтадам масавай работы саветаў. Разгортваючы працу сярод ударнікаў, сярод калгасьнікаў і бедноты, саветы, пад кіраўніцтвам кампартыі, будуць уцягваць новыя мільёны рабочых і сялян у актыўную працу сацыялістычнага будаўніцтва.

Асобная ўвага павінна быць зьвернута на ўцягненьне ў практычную работу саветаў жанчын-работніц, калгасьніц, батрачак, бяднячак і лепшых серадпячак. Тых жанчын, што выбіраюцца ў саветы, трэба паставіць на практычную працу, замацаваць іх, як савецкі актыў, апірацца на іх для далейшага пашырэньня жаночага актыву.

Важнейшай справай у працы саветаў саветы павінны з яшчэ большай настойлівасьцю разгортваць сацыялістычнае будаўніцтва, рашуча выкарчоўваць карэньні капіталізму і павялічваць абороназдольнасьць краіны.

Для таго, каб саветы сапраўды забясьпечвалі правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі, трэба ўзмацніць барацьбу супроць ухілаў ад лініі партыі, супроць правага ўхілу, супроць «левых» загібаў, супроць права-«левацкага» блёку і прымірэнчых да іх адносін. Асабліва небясьпечным зьяўляецца правы ўхіл і права-апартуністычная практыка ў працы саветаў. З гэтае прычыны ня можа быць месца правым апартуністам і бяспрынцыпным прымірэнцам у кіруючых органах саветаў. Бязьлітасная барацьба супроць права-апартуністычнай практыкі ўзьніме ролю саветаў у практычным правядзеньні генэральнай лініі партыі па ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Шырока разгортваючы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, ачышчаючыся ад усіх апартуністычных і прымірэнчых элемэнтаў у складзе саветаў, вядучы рашучую і бязьлітасную барацьбу супроць контр-рэвалюцыйных, шкодніцкіх нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў, як клясавых ворагаў пралетарыяту, саветы пад кіраўніцтвам кампартыі з гонарам будуць выконваць сваю важнейшую ролю органаў дыктатуры пралетарыяту, праводзячы ў жыцьцё рашуча і да канца генэральную лінію партыі.

Праца савецкага апарату цесна зьвязана з працай саветаў.

Савецкі апарат зьяўляецца выканаўцай дырэктыў партыі і ўраду. Гэта вымагае вялікай выразнасьці ў працы савецкага апарату. Аднак, за мінулыя часы мы маем рад прыкладаў таго, як клясава-варожыя пралетарскай рэвалюцыі элемэнты, якія прасачыліся ў савецкі апарат, імкнуліся выкарыстаць сваё становішча для контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай работы.

XVI зьезд УсеКП(б), кажучы аб недахопах савецкага апарату, даў наступнае ўказаньне: «Безадказнасьць, чыноўніцкае самаздавальненьне, адсут-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы